**Смолік А.І.**, *дацэнт,*
*прарэктар па вучэбнай*
*рабоце Беларускага*
*універсітэта культуры*

# САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ СІТУАЦЫЯ Ў КАНЦЫ XX СТАГОДДЗЯ

Сацыяльным інстытутам, які стварае ў грамадстве ўмовы для развіцця духоўнай дзейнасці, на ўсіх этапах цывілізацыі з'яўляецца дзяржава. Паводле англійскага гісторыка нашага стагоддзя А.Тойнбі, асноўнымі элементамі ў жыцці цывілізаванага грамадства з'яўляюцца палітыка, культура і эканоміка [Тойнби А. Постижение истории. — М., 1966]. Шэраг культуролагаў схільны сцвярджаць, што культура, у адрозненне ад іншых сфер, менш за ўсё паддаецца інстытуцыянальнаму ўпарадкаванню. Па прычыне асаблівай ролі творчага пачатку ў культуры яна звязана з індывідуальнай дзейнасцю пісьменнікаў, музыкантаў, мастакоў, якая не ўкладваецца ў межы рэгламентацыі. Такой пазіцыі прытрымліваюцца многія дзеячы культуры і мастацтва, якія заўсёды выступалі супраць умешвання дзяржавы або іншых сацыяльных інстытутаў у духоўную творчасць.

У постсавецкім грамадстве, якім з'яўляецца і Рэспубліка Беларусь, дзяржава адыгрывае важную ролю ў развіцці культуры. Аб'ём культурнай палітыкі, што ажыццяўляе дзяржава, вельмі значны. У Беларусі склалася мадэль кіравання культурай, заснаваная на моцнай урадавай адміністрацыі, якая не толькі падтрымлівае культуру фінансава, але і каардынуе работу іншых урадавых і няўрадавых структур.

Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і законам "Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь" вызначаны наступныя задачы ў галіне культуры:

— фарміраванне сродкамі культуры інтэлектуальных і маральных асноў стварэння дэмакратычнай прававой дзяржавы;

— зберажэнне гісторыка-культурнай спадчыны;

— кансалідацыя дзеячаў нацыянальнай культуры на аснове арганічнага спалучэння гуманістычных традыцый народнай культуры беларусаў і іншых культур, сучаснай культурнай спадчыны;

— прызнанне ідэалагічнай значнасці культуры;

— забеспячэнне спалучэння духоўнай культуры насельніцтва рэспублікі з высокай палітычнай, прававой, эканамічнай і экалагічнай культурай;

— здзяйсненне рацыянальнай моўнай палітыкі, якая забяспечвае высокую культуру беларускай мовы ва ўсіх сферах культуры разам з выкарыстаннем рускай мовы, моў нацыянальных меншасцей, што жывуць у рэспубліцы, іншых моў і знакавых сістэм, неабходных для багацця ўнутраных і знешніх зносін беларускай нацыі;

— забеспячэнне прасторы для міжнацыянальных і міждзяржаўных культурных кантактаў паміж Рэспублікай Беларусь і іншымі краінамі.

У перыяд пераходу да дэмакратычнага грамадства, заснаванага на рыначных адносінах, дзяржава — асноўны сацыяльны інстытут, здольны кампенсаваць недахопы інфраструктуры, сама не ў стане забяспечыць развіццё культуры ў адпаведнасці з агульнанацыянальнымі патрабаваннямі. Аналіз дзейнасці прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый культуры Беларусі ў постсавецкі час сведчыць: без падтрымкі і рэгуляцыі з боку дзяржавы мастацтва і навука не змогуць выжыць і будуць асуджаны на скарачэнне сваіх маштабаў і функцый. На наш погляд, дзяржаўная культурная палітыка Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе ўяўляе прадуманы і адказны выбар мэт і прыярытэтаў, стварэнне механізмаў іх ажыццяўлення і мэтанакіраванае выдзяленне рэсурсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У перыяд дэмакратызацыі і пабудовы незалежнай прававой дзяржавы ў Беларусі склалася якасна новая інстытуцыянальная структура ўрадавых установ, якія сутыкаюцца з пытаннямі культуры або вырашаюць такія пытанні. У Рэспубліцы Беларусь існуе некалькі тыпаў міністэрстваў: па-першае, міністэрствы агульнага характару, такія як міністэрствы эканомікі, фінансаў; па-другое, міністэрствы, блізкія да галіны культуры (напрыклад, Міністэрства адукацыі). Акрамя гэтага, функцыянуюць структуры, якія ўплываюць на стан культуры (архівы, выдавецтвы, радыё і тэлебачанне). Такі ведамасны падзел сферы культуры, думаецца, не вельмі спрыяе рэалізацыі дзяржаўнай культурнай палітыкі.

У выніку гэтага адбываюцца нездаровае суперніцтва, канфлікты паміж ведамствамі (сярод якіх Міністэрства культуры займае не самыя моцныя пазіцыі). На гэта звяртаў увагу дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь міністр культуры А.У.Сасноўскі, выступаючы на парламенцкіх слуханнях у чэрвені 1998 г.: “Аднак,— гаварыў ён,— не змяншаецца ўплыў адмоўных тэндэнцый, уласцівых сённяшняму стану нацыянальнай культуры. Да іх ліку трэба аднесці, напрыклад, недастатковае бюджэтнае фінансаванне культуры, штогадовае зніжэнне ўзроўню аплаты працы тых, хто заняты ў сферы культуры, адносна іншых галін народнай гаспадаркі, адсутнасць ільготнага падаткаабкладання ў гэтай галіне, скарачэнне камплектавання бібліятэк усімі відамі друкаванай прадукцыі, адставанне ў будаўніцтве і рэстаўрацыі шэрага культурных аб’ектаў, не адпаведную часу запаволеную распрацоўку неабходных заканадаўчых і нарматыўных дакументаў”.

Існаванне паўнацэннага Міністэрства культуры, на нашу думку, неабходнае таму, што дзяржаўны сектар у культуры захоўвае сваю важнасць. Да таго ж, існуе значная колькасць установ культуры, якія знаходзяцца пад

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяржаўным кіраўніцтвам, а фінансаванне іх з пазабюджэтных крыніц яшчэ толькі складваецца. Даследаванне праблем фінансавання культурнага жыцця паказвае, што, нягледзячы на асобныя адхіленні ў агульнай долі расходаў на культуру ва ўнутраным валавым прадукце (УВП), назіраецца тэндэнцыя да яе зніжэння. Гэтая доля з'яўляецца занадта нізкай у еўрапейскім разуменні. Так, у Рэспубліцы Беларусь штогод выдаткоўваецца на культуру не больш за 1 %, хаця Законам аб культуры прадугледжана выдаткоўваць 3 %. Неабходна заўважыць: Міністэрства культуры ў асобныя гады недаатрымлівала нават тых сродкаў, якія былі закладзены ў бюджэце. Такім чынам, размеркаванне дзяржаўных фінансаў паміж галіновымі міністэрствамі паказвае, што культура ў нашай краіне фінансуецца ў апошнюю чаргу. Доля затрат на культуру ў дзяржаўным бюджэце хутчэй мае дэкларатыўны характар. Аб гэтым сведчаць статыстычныя даныя (у працэнтах): 1990 — 0,76; 1991 — 0,78; 1992 — 0,84; 1993 — 1,9; 1994 — 1,5; 1995 — 0,6; 1996 — 0,7; 1997 — 0,95; 1998 — 1,6.

Такім чынам, эканамічны крызіс, які ахапіў грамадства, адмоўна адбіваецца на фінансаванні і матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні культурных устаноў.

Падобны стан фінансавання вымушае культурныя ўстановы і арганізацыі, а таксама творцаў і спажыўцоў культуры шукаць недзяржаўныя крыніцы матэрыяльнага забеспячэння культуры і мастацтва. Характэрным рухам у механізме камерцыйнай рэгуляцыі мастацкага жыцця 80—90-х гг. стала падключэнне бізнесу да масавай культуры, і нават да розных накірункаў контркультуры. Ва ўмовах паўсюднага ўмацавання рынкавых адносін і новых формаў гаспадарання, развіццё якіх ускладняецца працяглым эканамічным крызісам і ростам інфляцыі, шэраг клубаў, бібліятэк, Дамоў і Палацаў культуры, тэатраў, паркаў, іншых устаноў культуры вымушаныя

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

займацца рознымі відамі культурна-камерцыйнай дзейнасці, прадпрымальніцтвам. Аналіз культурных працэсаў у краінах з развітай эканомікай сведчыць: прадпрымальніцтва заўсёды адыгрывала там значную ролю ў рэгуляцыі культурнай дзейнасці. Гэтая роля ўзмацнялася па меры ўдасканалення грамадства.

Дадзеная форма фінансавання толькі яшчэ складваецца на Беларусі. Яна з'яўляецца кволай і не здольная значна ўплываць на стан螺знага тыпу ўстаноў культуры. Так, удзельная вага ўласных даходаў тэатральна-відовішчных прадпрыемстваў у 1997 г. склала толькі 38%. Культурна-асветныя ўстановы нашай краіны за гэты ж перыяд атрымалі ў выніку вытворчай гаспадарчай дзейнасці 8,6 млрд. руб., што склала ўсяго 7,4% ад агульных паступленняў [гл.: Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: Навук.-інфарм. зборнік — Мн., 1998. – С.12].

У 90-я гг. узнікае такая форма матэрыяльнай падтрымкі сферы культуры, як фонды. На стварэнне ўмоў, спрыяльных для творчага развіцця асобы, сацыяльную падтрымку, захаванне гістарычнай спадчыны, культурных традыцый скіраваны Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Мерапрыемствы, накіраваныя на пошук, станаўленне, творчае развіццё таленавітай моладзі, фінансуюцца Фондам Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Сродкі фондаў ствараюцца за кошт асігнаванняў з рэспубліканскага бюджэту, дабрачынных узносаў і рэзервовага фонду Прэзідэнта. У 1998 г. уведзены прэміі і гранты Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва. Штогод прысуджаецца 27 прэмій за дасягненні ў галіне культуры і мастацтва, уклад у выхаванне творчай моладзі, развіццё міжнародных культурных сувязей.

Вывучэнне крыніц фінансавання паказвае: у Беларусі паспяхова развіваецца сістэма фінансавання культуры з бюджэтаў самакіравання. Кожны год на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурную дзейнасць мясцовыя ўлады выдаткоўваюць пэўную суму грашовых сродкаў. Намі падлічана, што доля ўкладання ў культуру з мясцовых бюджэтаў вагаецца ў межах 2,08—3,41% ад усяго бюджэту. Міністэрства культуры не мае магчымасці ўплываць на фінансаванне патрэб культуры мясцовымі ўладамі. На парламенцкіх слуханнях у 1998 г., прысвечаных Дзяржаўнай нацыянальнай праграме "Культура", адзначалася, што патрэбы раённых устаноў культуры задавальняюцца толькі на 44%, у тым ліку капітальны рамонт — на 9%, набыццё абсталявання — на 18%, перыядычныя выданні і літаратура — на 10% [Дзяржаўная нацыянальная праграма "Культура" і ўдасканаленне заканадаўчай базы галіны ў Рэспубліцы Беларусь: Парламенцкія слуханні (11 чэрвеня 1998 г.).– С.93].

Складваецца ў рэспубліцы такая форма патраніравання сферы культуры, як спонсарства, якое стрымліваецца недасканалым падаткаабкладаннем. Гэтая форма даўно ўжо развіваецца ў заходнееўрапейскіх краінах.

Аналіз сістэмы фінансавання культурнага жыцця ў Беларусі паказвае, што ў 90-я гг. пачалі фарміравацца прынцыпова новыя крыніцы матэрыяльнай падтрымкі культуры. Скарачэнне паступленняў у сферу культуры ад дзяржаўнага бюджэту тлумачыцца эканамічным крызісам, які адмоўна адбіваецца на ўсёй сацыяльнай сферы, і асабліва на галіне культуры. Негатыўна адбіваецца на сацыяльна-эканамічным развіцці Рэспублікі Беларусь эканамічны цяжар чарнобыльскай катастрофы. Дзяржава штогод выдаткоўвае значныя фінансавыя сродкі на медыцынскае абслугоўванне насельніцтва, пацярпелага ад аварыі, на перасяленне насельніцтва з небяспечных раёнаў, сацыяльную абарону грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы, кантроль за навакольным асяроддзем і г.д. Падлікі эканамічных страт толькі за 1986—1990 гг. сведчаць: за гэты перыяд дзяржава на ліквідацыю наступстваў аварыі выдаткавала 29 млрд. дол., што складае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

больш за 17% нацыянальнага даходу Беларусі за той жа перыяд. Сумарныя эканамічныя страты нашай краіны да 2015 года складуць 235 млрд. дол. [Чарнобыль.Погляд праз дзесяцігоддзе: Даведнік / Беларус. энцыкл.; Рэд. калегія Я.В.Малашэвіч і інш.— Мн.: БелЭн, 1996 — С.84].

Сацыяэкалагічныя фактары паўплывалі на структуру самарэгуляцыі культуры. Акрамя дзяржавы, якая вызначае культурную палітыку ў грамадстве і ўздзейнічае на яе рэгуляцыю, у самой культуры ўтрымліваюцца структуры яе забеспячэння, адносна аўтаномныя ад знешняга ўплыву. Яны могуць насіць разнастайны характар, адрозніваецца адна ад адной у залежнасці ад узроўню гаспадарчага развіцця грамадства, яго палітычнай сістэмы, уплыву рэлігіі, структуры цывілізацыі, ступені развіцця творчых арганізацый і інш. Вывучэнне сучаснай сітуацыі ў галіне культуры дазваляе нам выказаць меркаванне аб тым, што ў структуры самарэгуляцыі беларускай культуры адбываюцца імклівыя змены. У адпаведнасці з пунктам гледжання прафесара Пецярбургскага універсітэта М.С.Кагана тут мы сутыкаемся з дзеяннем сінергетычнага закона развіцця складаных сістэм: чалавецтва спрабуе вызначыць шляхам спроб і памылак спосабы рэарганізацыі культурнай сістэмы для пераводу яе ў новы ўстойлівы стан. [Каган М.С. Философия культуры.— СПб, 1996.- С.382].

У сучасным грамадстве ўзнікаюць розныя культурныя ўстановы і арганізацыі, якія маюць на мэце ажыццяўленне духоўнай вытворчасці, трансляцыю культуры, арганізацыю і планаванне культурнай дзейнасці, фарміраванне высокіх духоўных патрэб, стварэнне ўмоў для выяўлення і рэалізацыі дзейнасці людзей. З улікам гэтых задач дзяржава сфарміравала ў свой час разгорнутую сетку ўстаноў культуры. Бібліятэкі, клубы, музеі, тэатры, школы, паркі ўтварылі адзіны сацыяльна-культурны комплекс. У іх ёсць агульныя мэты, склаліся аднародныя прынцыпы дзейнасці і падобныя

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

гаспадарчыя механізмы. Іх дзейнасць будуецца на прынцыпах даступнасці, добраахвотнасці, апоры на грамадскую ініцыятыву і самадзейнасць, на прынцыпах спалучэння індывідуальнай, групавой і масавай работы, галоснасці, кіравання і самакіравання, выкарыстання розных (законных) крыніц фінансавання, абавязковага ўліку мясцовых асаблівасцей у гістарычным і культурным развіцці, дыферэнцыяцыі і спецыялізацыі.

**Коган І.Л.,**
*суіскальнік кафедры*
*сацыялогіі і культуразнаўства*

## КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ: ІДЭАЛ І ІЛЮЗІЯ

*Нацыянальная ідэя і нацыянальная культура.* Апошнім часам беларускае грамадства дужа займаюць пошукі шляхоў свайго культурнага адраджэння. Абвяшчаюцца лозунгі пра неабходнасць беларусізацыі ўсіх слаёў насельніцтва незалежна ад таго, да якой нацыі альбо да якой культуры належыць той або іншы індывід. Наколькі правамоцнае або, лепш сказаць, апраўданае такое, з аднаго боку, гвалтоўнае і шмат у чым фармалізаванае, а з другога, неабходнае дзеля культурнага адраджэння абеларушчванне шматнацыянальнага насельніцтва Беларусі дзяржавай?

Магчыма, пастаноўка гэтага пытання выкліча здзіўленне, але апошняе толькі пакажа на павярхоўнае стаўленне да такіх глабальных паняццяў, як культура, мова, нацыя. Мы маем мноства гістарычных прыкладаў, калі людзі, што працуюць на тэрыторыі Беларусі, або этнічныя беларусы, што жывуць за яе межамі, стваралі свае творы мастацтва зусім не ў межах беларускай культуры. Да іх можна аднесці такіх дзеячаў, як Казімір Семяновіч, што выдаў у 1650 г. у Амстэрдаме кнігу "Вялікае мастацтва



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ